*Паэзіі краса і сіла*

# "ПАЛЯЦІ, МАЯ МЫСЛЬ, ЛЁТАМ СОКАЛА…"

## ЯНКА КУПАЛА І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПЕСЕННАЯ ЛІРЫКА

*Песняй толькі на свеце жыву я…*
Я. Купала.

Выключная роля Янкі Купалы ў развіцці нацыянальнай песеннай лірыкі тлумачыцца спецыфікай мастацкай адоранасці паэта. Інтанацыйная шматстайнасць купалаўскага радка характарызуецца надзвычайнай меладычнасцю, напеўнасцю, дакладнымі абрысамі рытмічнага малюнка, багаццем фонікі і паэтычнага сінтаксісу. Паэзія для Купалы пачынаецца з музыкі. Музычнасць успрымання, бачання свету – вызначальная рыса яго непаўторнага таленту. Першым ва ўсёй беларускай літаратуры паэт адчуў, што кожная з'ява быцця – пейзажны малюнак, бытавы прадмет, рух інтымнага пачуцця – мае сваю непаўторную музыку, якую трэба ўлавіць, выявіць у найтанчэйшых нюансах, каб, узнавіўшы на струнах уласнай душы, сплавіць з вершаваным словам. Акадэмік І. Навуменка падкрэсліваў: "Менавіта музыкальны, а не жывапісны, не практычны бок з'явы, прадмета, малюнак перш за ўсё цікавіць паэта" [1, с. 22]. Эвалюцыя Купалы ў сферы песеннай лірыкі была складанай, шматстайнай і надзвычай плённай. Па сутнасці, малады Купала на пачатку творчага шляху працягваў традыцыю Я. Чачота і Ф. Багушэвіча, ствараў свае песні паводле народных узораў. Невыпадкова ў яго спадчыне сустракаюцца творчая кантамінацыя народных танцавальных рытмаў ("Юрачка", "Мяцеліца"), дасканалае выкарыстанне найважнейшых вобразна-стылёвых дасягненняў народнай песні (беларускай, польскай, рускай, украінскай), спробы пераймання яе прымітыўна-простай (на першы погляд) паэтыкі. Практычна ўсе творы падобнага плана заснаваны на прыёме паралельнага сінтаксічна-кампазіцыйнага размяшчэння аднатыпных элементаў паэтычнага выказвання (з'яў, вобразаў, матываў), што супастаўляюцца паміж сабой. Самыя разнастайныя спалучэнні сінтаксічнага, псіхалагічнага і дапаможнага страфічнага паралелізму надавалі песням Купалы непаўторны нацыянальны каларыт і меладычнасць гучання. Сістэма сінтаксічнай арганізацыі вершаванай мовы, ці паэтычны сінтаксіс, таксама зведала выразныя ўплывы народнай вершабудовы, што асабліва прыкметна ў творах пейзажнага і грамадска-сацыяльнага зместу. Паэтычная інтанацыя многіх твораў цалкам сугучна мелодыцы народных песень, гэта абумоўлена не толькі супадзеннем агульнай ролі паўтораў, анафар, эпіфар, рытарычных фігур, але і спецыфікай будовы сінтаксічных сувязей унутры вершаваных радкоў і выявілася ў шырокім выкарыстанні далучальных канструкцый, большай свабодзе словаразмяшчэння, асаблівай сінтаксічнай ролі вершаваных радкоў-пераносаў. На гэтым шляху Я. Купала будзе, безумоўна, першым, але не адзіным. Менавіта ў такім стылі загучыць песенная лірыка Я. Коласа, З. Бядулі, К. Каганца, Ц. Гартнага.

Сапраўды тытанічная падзвіжніцкая дзейнасць Я. Купалы ў сферы нацыянальнай песеннай лірыкі спалучае ўсе найважнейшыя дасягненні беларускай народнай песні і традыцыі прафесійнай песні XIX – пачатку XX ст., прадвызначае асноўныя шляхі далейшай яе эвалюцыі.

Эманацыя купалаўскай песеннай лірыкі магутная, шматзначная, шматузроўневая і шматвектарная. У класічнай песні Я. Купалы важнымі становяцца глыбокая шчырасць, высакароднасць пачуцця, выключная самабытнасць, што дасягаецца арыгінальнасцю спалучэння паэтычнага тэксту і схаванай у ім да наканаванага часу музыкі, яскравае выяўленне нацыянальнага характару, абагульненне і творчае развіццё асноўных элементаў мовы народнай песні і вяртанне апошняй уласных здабыткаў, шырокі разліў меладычнага дыхання вакальных твораў, элегічнасць гучання пастэльных тонаў споведзі і роскат нот пратэсту і гневу. Усё гэта выводзіць песенную лірыку Я. Купалы за межы ўласнабеларускай традыцыйнай песні ў нашым звыклым успрыманні, што і садзейнічае з'яўленню пераходных формаў класічнай песні.

Вялікай любоўю да сваёй роднай старонкі напоўнена песня "Спадчына" (кампазітар І. Лучанок) [3, с. 320], для якой характэрны напеўная мелодыка, паэтычная лексіка, мастацкія азначэнні (*ласка матчына*, *дуб апалены*, *нуднае ягнят бляянне-зоў*), эпітэты-прыдаткі (*казкі-сны*, *светач-полымя*), індывідуальна-аўтарскія эпітэты (*лесу шэлест верасны*, *сны нязводныя*), метафары (*тын, што лёг ля вёсак покатам*). Агульнамоўныя эпітэты *І ў белы дзень і ў чорну ноч* узмацняюць ўздзеянне. Усё ў творы скіравана на тое, каб выклікаць асабістыя ўспаміны слухача. Майстэрства класіка настолькі магутнае, што ў 1972 г. песня атрымала Першую прэмію на Усесаюзным конкурсе, а яе выканаўца В. Вуячыч – Вялікі спецыяльны прыз на Міжнародным фестывалі сучаснай эстраднай песні ў Токіа ў 1973 г.

Адным з самых яркіх эстэтычных складнікаў светапогляднай сістэмы Я. Купалы выступае катэ-

горыя трагізму. Асновавызначальнай у светаўспрыманні народнага песняра з'яўляецца, безумоўна, неадступнасць трагічнасці існавання на гэтым свеце. Невыпадкова Р. Бярозкін называў Я. Купалу "вялікім трагічным паэтам", а А. Лойка заўсёды падкрэсліваў выключную "крывавасць" сюжэтаў яго́ных твораў. Знамянальна, што падобная адметнасць уласціва практычнай большасці твораў са спадчыны паэта, незалежна ад іх жанрава-стылёвай прыналежнасці (дастаткова згадаць, што іскрамётная камедыя "Паўлінка" ў аўтарскім варыянце завяршалася надрыўным крыкам-плачам галоўнай гераіні). Напрыклад, незвычайны сваёй меладычнасцю, чароўнай плыннню музычных сугуччаў, што здзіўляюць фанетычным багаццем паэтычнага слова (*Як у моры, ў белым снегу, / Без днявання, без начлегу, / Ў бездарожжа, ў беспрыстанне / Едуць, едуць паязджане* [3, с. 324]), верш "Паязджане" (1918) навеяны падзеямі Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, аднак у ім прысутнічае даўняя тэма пошукаў беларускім народам свайго гістарычнага лёсу. "Паязджане" перадаюць прадчуванне катастрафічнасці будучай эпохі.

Варта пагадзіцца з выказваннямі В. Рагойшы пра выключную песенную лірыку паэта, якому ў гэтым аспекце няма роўных у гісторыі беларускага прыгожага пісьменства. Народны пясняр быў пачынальнікам беларускай трагічнай песні, хоць, канечне, яе вытокі мажліва прасачыць і ў народных галашэннях, плачах-песнях, у "Песнях" Мацея Бурачка, элегіях-развітаннях Адама Міцкевіча і Яна Чачота. Але калі ў згаданых аўтараў гэтыя спробы былі ўсё ж такі спарадычнымі, то ў спадчыне Я. Купалы складваецца адметная сістэма трагедыйнасці.

Так, у яго практычна не сустракаюцца творы, дзе апавядаецца пра бясклапотнае шчасце закаханых ці ўзнёсла спяваецца пра замілаванасць маляўнічымі абразкамі прыроды. Нават у найбольш яскравых пейзажных замалёўках падкрэсліваецца момант непаўторнасці красы і ненадзейнасць, нявечнасць апошняй, яе заканамерны зыход у нябыт, што заўсёды суправаджаецца пачуццём страты. У паэзіі Купалы, як і ва ўсёй славянскай традыцыі (асабліва рамантычнай), адпаведныя з'явы прыроды сімвалізуюць чалавечы лёс (ці не таму восень становіцца ўлюбёным сімвалам песеннай спадчыны песняра). Але менавіта адчуванне холаду, сівеpy, блізкай пагібелі вызначальныя:

*Штосьці трывожнае, зло-непрыхільнае*
*Сунецца з гэтай мярцвячай глушы...*
*Восень панурая, восень магільная!*
*Страшна ты чуткаму сэрцу, душы* [2, с. 119].

Адна з найбольш яскравых трагічных песень "Адцвітанне", напоўненая матывамі смутку, тугі, пачуццём адзіноты. Вельмі часта ў песенных творах Я. Купалы вобразы дрэў (явар, каліна, таполя, дубо́чак, сасна) сімвалізуюць закаханых, якім злыя сілы не даюць рэалізаваць сябе ў гэтым жорсткім, страшэнным сусвеце. Можа, толькі ў песні "Абнімі" (кампазітар А. Багатыроў) усхваляецца веліч і прыгажосць свету, што адкрываецца закаханым. Гэтаму падпарадкавана і ўся вобразна-выяўленчая палітра твора, дзе ўзаемадзейнічаюць багаты эмацыянальны рытміка-інтанацыйны лад, высокая культура слова, афарыстычнасць выслоўяў, адначасовае ўжыванне стылістычна нейтральных слоў і ўзнёслых тропаў (эпітэты *чары-сон*, *снег-пух*, дзеяслоўныя формы *ўзалоцімся*, *заіскрымся*, *зардзімся*), сімволіка твора:

*Ў дзень вясёлы мы сонцам пякучым*
*Заіскрымся ў нябесным прасторы,*
*З ветрам-сокалам душы заручым,*
*Ў пушчу-лес упляцём загаворы* [2, с. 124].

Характэрна, што падобны трагізм будзе вызначальны не толькі ў песнях выразна сацыяльнага зместу ("Родныя песні", "З песень аб сваёй старонцы"), у творах ваеннага цыкла ("Песні вайны", "Ваяк" і інш.), але і ў тэкстах пра каханне ("Даўгажданая", "Над ракою ў спакоі" і інш.). Спрыяе гэтаму і сістэма выяўленчых сродкаў, дзе вялікую ролю адыгрываюць не толькі тропы (што ўжо добра разгледжана ў купалазнаўстве), але і разнастайныя стылістычныя фігуры.

Увогуле, Я. Купала імкнуўся спасцігнуць веліч і трагізм народных балад, салдацкіх і рэкруцкіх песень, мілагучнасць калыханкі, іранічнасць жарту і прыпеўкі, велічнасць і ўрачыстасць грамадзянскай і інтымнай споведзі, што і прывяло да з'яўлення песні-балады, песні-маналогу, песні-рамансa.

Традыцыямі апошняй у творчай спалучанасці з дасягненнямі беларускай народнай песні пра каханне абумоўлена ўзнікненне такой унікальнай з'явы, як любоўная песня Я. Купалы. Яе апафеозам стала песня "Явар і каліна" (кампазітар Ю. Семяняка), напеўнасць і незвычайная элегічнасць якой вярнулі песню ў народ, бо яна была ўспрынята як народны першаўзор і ўключана ў "Анталогію беларускай народнай песні" (1968). Купалу цікавіў не так дакладны паэтычны сэнс слова, як яго гучанне, што садзейнічае пэўнаму настрою, элегічным перажыванням. Загадкавым і таямнічым робіць змест выкарыстанне аўтарскіх неалагізмаў і іх спалучэнняў з рознымі формамі дыялектызмаў (*смехаў русалчыных*, *павеваў ап'янчаных*), устарэлых слоў (*модлы*). Такога кшталту словаспалучэнні абумоўлены асаблівасцямі рамантычнай паэтыкі, дзе паэтычны вобраз ствараецца плаўнасцю гуку, мелодыі, напеву. Адсюль і з'яўленне шырокіх разгорнутых метафар: *шэпчуцца явар з калінаю, лісцікі зеленяй хваляцца, повесці сонных імшараў, росамі мыюцца раніцай.* Па сутнасці, мы маем адну вялікую метафару чалавечага шчасця. У творы наслойваюцца страфы і радкі, дзе рассыпаны метафары, увасабленні, але

разам з тым не ўзнікае адчування бязладнага стракацення, перагружанасці. Усе састаўныя часткі песні з'яднаны і ўзбагачаюць яе разнастайнымі асацыяцыямі і сэнсавымі адценнямі. Кожны элемент твора служыць адзінаму настрою – светламу смутку і шчымлівай радасці, выяўленню перажывання на фоне аднаго шырокага вобразнага прыпадабнення. Песня "Явар і каліна" адрозніваецца паэтычнасцю слоўніка (*лебядзіны*, *чары*, *росы*, *сонца*, *тайны* і інш.). Лексіка і вобразы, рытміка-інтанацыйная сіметрыя ствараюць напеўнасць верша:

*Чуецца музыка дзіўная*
*У повесцях сонных імшараў…*
*Цешыцца явар з калінаю,*
*Скінуўшы зімнія чары* [3, с. 183].

Падобны поспех знаменаваў перспектыўнасць купалаўскай школы ў беларускай любоўнай песеннай лірыцы, для якой з часу зараджэння становяцца вызначальнымі пластычнасць і непарушнасць меладычнага вобраза, выключная лірычнасць у абмалёўцы пачуццяў, стрыманасць выражэння ў спалучэнні з унутранай бурлівасцю страсці, незвычайны гукапіс, спецыфічны паэтычны сінтаксіс, што так дасканала перадае чысціню адносін паміж закаханымі ["Як у лесе зацвіталі" (Р. Пукст), "Ты прыйдзі…" (У. Алоўнікаў, М. Чуркін), "Як я полем іду" (М. Чуркін), "Як у лесе" (Д. Лукас), "Дзяўчынка, галубка мая" (А. Туранкоў), "Абнімі ты мяне" (А. Багатыроў) і інш.].

Менавіта ў гэтай школе будуць створаны найбольш яскравыя прыёмы будовы радка, унутранай рыфмоўкі, найбольш незвычайныя тропы і спосабы іх уключэння ў мастацкі тэкст. Заканамернасць і незвычайную плённасць падобнай эвалюцыі сцвердзіць творчая практыка Я. Коласа ("Зоры далёкія, зоры бліскучыя", "Маёй каханцы", "Глуха шэпча лес зялёны"), М. Багдановіча ("Раманс", "Скрылась кветамі", "Астры", "Вечнасць"), М. Танка ("А што гэта за даліна", "Быць чалавекам я рад", "Ганна", "Завушніцы", "Ave, Maria"), З. Бядулі, А. Русака. Асабліва перспектыўным з'яўляецца адраджэнне ўжо згаданых класічных для беларускай песеннай лірыкі традыцый у творчай практыцы аўтараў канца XX ст.

Пра выключную меладычнасць купалаўскай лірыкі сведчыць і тое, што многія вершы ён пісаў з выразным адчуваннем музыкі або ствараў іх на аснове пэўных народных мелодый. Найбольш яскрава гэты працэс выявіўся ў цыкле песень на вайсковыя матывы, якія друкаваліся пад адной назвай "Песні на ваяцкі лад". З'яўленне падобных узораў паводле народных мелодый абумоўлена верай паэта ў нацыянальнае адраджэнне і выклікана памкненнем узяць удзел у стварэнні беларускага войска з усімі неабходнымі для яго атрыбутамі, у тым ліку страявымі і маршавымі песнямі. Плённа выкарыстоўваючы і развіваючы традыцыі казацкіх, салдацкіх і рэкруцкіх песень, народную мелодыку, дасягненні паўстанцкіх маршаў XIX ст., Я. Купала не толькі перадаў іх першароднае гучанне, але і аздобіў старажытную музыку новым тэкстам. Поруч з народным песняром гэтай пачэснай справай займаўся і З. Бядуля, а таксама шэраг невядомых паэтаў, якія выдалі нават спецыяльны спеўнік для беларускага войска. Найбольш дасканалай аказалася песня З. Бядулі "Ваяка йдзець", дзе беларускае слова вельмі ўдала лягло на маршавыя рытмы. За кароткі прамежак часу былі закладзены адпаведныя традыцыі ваеннай песні, што таксама паўплывала на паэтыку песеннай лірыкі, надало апошняй новыя грані.

Яскравая старонка беларускай песеннай спадчыны – творы патрыятычныя і гімнаграфічныя, надзвычай блізкія па сваёй ідэйнай скіраванасці, але адрозныя сілай гучання. Купалаўская песня пачыналася з увасаблення ў музыцы кампазітарам Людамірам Рагоўскім верша "А хто там ідзе?" (1910), які стаў неафіцыйным беларускім гімнам да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пра долю народа, яго мары аб шчасці спявалі многія творы Я. Купалы, большасць з якіх можна было б назваць гімнам беларусаў на адпаведным гістарычным этапе ("Малітва", "Моладзі", "Не пагаснуць зоркі ў небе", "Спадчына"). Менавіта з гэтай традыцыі ўзляцяць не толькі сокалы песняра ("Маладая Беларусь"), але і "Пагоня" М. Багдановіча, цэлая плеяда малітваў за Беларусь Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна.

Адметнае месца ў песеннай лірыцы Я. Купалы належыць жартаўлівым ці часам сумнаватым іранічным творам. Высмейваючы адмоўныя якасці нацыянальнага характару, народны паэт у песнях сатырычнага зместу ("З кірмашу", "І як тут не смяяцца", "Паніч і Марыся", "Благая жонка") паказаў, што беларус не толькі ўмее плакаць, але і здольны крытычна паглядзець на сябе, свой побыт, убачыць светлыя старонкі ў даволі аднастайным існаванні. Вобразна-выяўленчая сістэма падобных твораў даволі адметная, што абумоўлена выразнай спецыфікай іроніі як галоўнага тропа. Гэта пацвярджае і творчая практыка паэтаў-песеннікаў Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, Л. Дранько-Майсюка, А. Барскага.

Творчасць славутага Купалы шматгранная і невымерная. Яго велічная постаць адорвае нас духоўнай энергіяй, любоўю да роднай песні і верай у светлую будучыню.

**Спіс літаратуры**

1. **Навуменка, І. А.** Янка Купала / І. А. Навуменка. – Мінск, 1980.
2. **Купала, Я.** Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1997. – Т. 3 : Вершы. Пераклады 1911 – 1914. – 342 с.
3. **Купала, Я.** Вершы. Паэмы. П'есы / Я. Купала; прадм. У. Гніламёдава. – Мінск : Харвест, 2007. – 704 с.

**Ірына БАРОЎСКАЯ,**
кандыдат філалагічных навук.

*Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.*